АКЦЫЯ

# Міласэрная бібліятэка

**Калектыў гомельскай гарадской бібліятэкі-філіяла № 8 імя Кірылы Тураўскага ўжо два дзесяцігоддзі займаецца дабрачыннасцю, праводзіць акцыі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, ладзіць выставы майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці, творчыя сустрэчы.**

У бібліятэцы-філіяле праходзяць абласныя спаборніцтвы па шахматах і шашках сярод інвалідаў, даўно кантактуе калектыў і з таварыствам інвалідаў Савецкага раёна Гомеля. За плённую і шматгадовую працу загадчыцы бібліятэкі Антаніне Уваравай нядаўна ўручана медаль Гомельскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы ў гонар прападобнай Манефы Гомельскай.

Да Міжнароднага дня інвалідаў калектыў наведаў Дуянаўскі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў. Як адзначыла Антаніна Уварава, з такімі візітамі раней пабывалі ў насельнікаў аналагічных прытулкаў у Прысна (Веткаўскі раён) і ў Васільеўцы (Гомельскі раён). Заўсёды едуць не з пустымі рукамі, а з кніжкамі, адзеннем і салодкімі пачастункамі, якія актыўна збіраюць чытачы і ўвесь калектыў культурнай установы.

І гэты дабрачынны візіт таксама дапамаглі здзейсніць добрыя людзі: Валянцін Барысенка, дырэктар філіяла "Аўтобусны парк № 1" ААТ "Гомельаблаўтатранс", старшыня прафсаюзнага камітэта Аксана Даніленка. Менавіта яны выдзелілі для міласэрнай мэты і аўтобус, і салодкія падарункі.

На сустрэчы гучалі вясёлыя песні, якія ўздымалі настрой у прысутных. Гледачам-інтэрнатаўцам вельмі спадабалася выступленне народнага хору "Вязанка" з Брылёўскага дома культуры пад кіраўніцтвам Валерыя Арлова, вершы на беларускай мове, якія ўзнёсла прачытала паэтэса Ганна Атрошчанка.

**Ганна ПЕРАРОСТ**